ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Праграма карэкцыйных заняткаў «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная праграма карэкцыйных заняткаў «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» (далей – праграма) прызначана для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

2. Змест дадзенай праграмы не мае рэгламентацыі па часе вывучэння. Колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага матэрыялу вызначаецца педагагічным работнікам на падставе вынікаў педагагічнай дыягностыкі. Педагагічны работнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне раздзелаў, тэм, вучэбнага матэрыялу ўнутры тэмы ў межах гадзін, рэгламентаваных вучэбным планам спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

3. Мэта – фарміраванне ўменняў свядома набываць інфармацыю аб разнастайных аб’ектах і з’явах навакольнай рэчаіснасці на аснове асваення структуры мэтанакіраванай пазнавальнай дзейнасці.

4. Задачы:

фарміраванне матывацыйна-рэгулятыўнага кампанента пазнавальнай дзейнасці, які забяспечвае яе мэтанакіраванасць і арганізаванасць: пазнавальных інтарэсаў і сістэмы самарэгуляцыі пазнавальнай дзейнасці;

развіццё інфармацыйна-аперацыйнага кампанента пазнавальнай дзейнасці: пазнавальных працэсаў, якія забяспечваюць прыём, апрацоўку і захаванне інфармацыі (успрыманне, мысленне, уяўленне, памяць);

развіццё моўнага кампанента пазнавальнай дзейнасці: авалоданне ўменнямі рэалізоўваць і адлюстроўваць вынікі працэсу пазнання з дапамогай сродкаў мовы, засваення моўных абагульненняў.

5. Змест дадзенай праграмы ўключае наступныя раздзелы:

фарміраванне матывацыйна-рэгулятыўнага кампанента пазнавальнай дзейнасці;

развіццё інфармацыйна-аперацыйнага кампанента пазнавальнай дзейнасці;

развіццё моўнага кампанента пазнавальнай дзейнасці.

Змест карэкцыйнай работы з кожным вучнем у рамках выдзеленых раздзелаў вызначаецца настаўнікам-дэфектолагам на дыягнастычнай аснове. Рэалізацыя работы над уменнямі першага раздзела прадугледжваецца на ўсіх карэкцыйных занятках і адлюстроўваецца ў методыцы работы над заданнем.

6. Карэкцыйныя заняткі могуць праводзіцца з групай дзяцей (5-6 чалавек), падгрупай (2–4 чалавекі) або індывідуальна. Колькасць неабходных заняткаў той ці іншай формы вызначаецца настаўнікам-

дэфектолагам на аснове ўліку індывідуальных асаблівасцей развіцця і ўзроўню самастойнасці вучняў.

На карэкцыйных занятках выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя метады: наглядныя (дэманстрацыя, назіранне і іншыя), практычныя (практыкаванне, гульня, выкарыстанне прадуктыўных відаў дзейнасці, вопыт, мадэляванне, стварэнне апор і іншыя), славесныя (гутарка, тлумачэнне, інструктаж і іншыя). Выкарыстоўваюцца прыёмы: маркіраванне, дзейнасць з апорай на ўзор, план, алгарытм, схему, па аналогіі і іншыя.

7. Асноўныя патрабаванні да вынікаў карэкцыйнай работы – сфарміраваная структура мэтанакіраванай пазнавальнай дзейнасці, якая знаходзіць вынік у тым, што вучні ўмеюць:

арыентавацца ва ўмовах пазнавальнай задачы і вызначаць мэту працэсу пазнання;

рэалізоўваць працэс рашэння пазнавальнай задачы, выбіраючы і выконваючы неабходныя пазнавальныя аперацыі;

адлюстроўваць працэс і вынік рашэння пазнавальнай задачы з дапамогай сродкаў мовы;

ажыццяўляць самарэгуляцыю пазнавальнай дзейнасці.

Чакаемым вынікам карэкцыйнай работы стане таксама з’яўленне ў вучняў пазнавальных інтарэсаў.

Вынікі карэкцыйнай работы на занятках «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» забяспечаць павышэнне ўзроўню паспяховасці вучняў у вучэбнай дзейнасці, у засваенні зместу навучальных праграм.

## **ГЛАВА 2**
## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### РАЗДЗЕЛ 1
### ФАРМІРАВАННЕ МАТЫВАЦЫЙНА-РЭГУЛЯТЫЎНАГА КАМПАНЕНТА ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

1.1. Фарміраванне пазнавальнай матывацыі

Фарміраванне пазнавальных матываў: інтарэсу да змястоўнага боку пазнавальнай дзейнасці і цікавасці да працэсуальнага боку пазнавальнай дзейнасці, да авалодання спосабамі вырашэння пазнавальных задач; развіццё патрэбнасці ў самаразвіцці, набыцці новых ведаў і ўменняў.

1.2. Фарміраванне цэласнай сістэмы самарэгуляцыі пазнавальнай дзейнасці

Уменні, якія фарміруюцца:

уменні мэтавызначэння:

арыентавацца ў прапанаваным заданні – пазнавальнай задачы: вылучаць аб’екты, пра якія ідзе гаворка; адносіны, якія звязваюць гэтыя аб’екты; патрабаванні задачы: што неабходна ўстанавіць, які вынік атрымаць у ходзе рашэння, г. зн. мэта дзейнасці, сукупнасць патрабуючых дзеянняў, мадэль умоў выканання дзейнасці, правіл выканання задання;

арыентавацца ў заданні пры розных формах яго прад’яўлення (малюнак,схема, тэкст, словы настаўніка і іншае);

арыентавацца ў заданнях з паступовым павелічэннем колькасці дзеянняў, якія патрабуюцца для выканання задання (у шматступеньчатых інструкцыях), умовах іх выканання;

арыентавацца ў падобных заданнях, вылучаючы іх адрозненні (колькасць, склад патрэбных дзеянняў, умовы выканання);

вызначаць, якое можа быць заданне-задача, абапіраючыся на прадстаўлены матэрыял (недамаляваныя выявы прадметаў, шэраг сюжэтных малюнкаў, часткі прадметнай карцінкі, словы з прапушчанымі літарамі, шэраг слоў і іншае);

аддзяляць зразумелае ад незразумелага ва ўмовах пазнавальнай задачы;

ставіць і ўтрымліваць мэту дзейнасці да канца выканання задання;

уменні планавання:

папярэдне планаваць будучую дзейнасць – складаць праграму выканальніцкіх дзеянняў (устанаўліваць змест і паслядоўнасць дзеянняў па выкананні пазнавальнай задачы);

складаць план рашэння пазнавальнай задачы ў розных формах (выяўленчай – карцінкі, схемы; вербальнай – вуснай, пісьмовай);

вербалізоўваць праграму будучай дзейнасці, рэалізаванай дзейнасці;

уменні выканальніцкія:

выконваць дзеянні ў пэўнай паслядоўнасці, арыентуючыся на прапанаваныя (складзеныя) план, алгарытм, памятку;

утрымліваць у працэсе дзейнасці праграму выканання задання, прадстаўленую ў вуснай вербальнай форме;

выбіраць спосабы дзеянняў і арганізоўваць іх паслядоўную рэалізацыю;

падпарадкоўваць свае дзеянні мэце і зададзенай сістэме патрабаванняў (правіл);

дзейнічаць па ўзоры, памяці, славеснай інструкцыі (вуснай, пісьмовай);

уменні самакантролю:

ажыццяўляць самакантроль на этапе прыняцця задання (узнаўленне сутнасці задання-задачы, пажаданага выніку, мадэлі значных умоў дзейнасці, правіл яе выканання);

ажыццяўляць самакантроль па ходзе дзейнасці з апорай на ўзор, складзены план, схему, алгарытм дзейнасці, памятку; завяршаць кожны этап дзейнасці параўнаннем з узорам, планам, алгарытмам (паэтапны кантроль – правільнасць паслядоўнасці і спосабу дзеянняў);

адзначаць памылкі па ходзе дзейнасці і выпраўляць іх;

ажыццяўляць самакантроль па выніку дзейнасці (выніковы кантроль: што трэба было зрабіць, ці ўсё зрабіў, ці правільна зрабіў); прымаць рашэнне аб дасягненні мэты дзейнасці (атрыманні выніку, які патрабуецца) або аб карэкціроўцы дзейнасці;

спраўджваць выкананую працу з узорам, знаходзіць памылкі і выпраўляць іх;

уменні абагульнення:

па завяршэнні дзейнасці абагульняць: што трэба было зрабіць (якую задачу вырашыць), ці вырашылі пастаўленую задачу і як змаглі яе вырашыць (выкананне якіх дзеянняў спрыяла яе вырашэнню);

вызначаць агульны спосаб выканання заданняў пэўнага тыпу;

вырашаць адну і тую ж пазнавальную задачу варыятыўна, рознымі спосабамі;

ажыццяўляць перанос спосабу рашэння пазнавальнай задачы-задання на аналагічныя заданні, заданні з іншым матэрыялам, у новыя ўмовы;

складаць заданні, аналагічныя выкананаму;

рэфлексіўныя ўменні:

ацэньваць выкананую дзейнасць з пазіцый паспяховасці (дасягнення мэты), прымаць рашэнне аб дасягненні альбо немагчымасці дасягнення мэты дзейнасці (атрыманні выніку, які патрабуецца);

ацэньваць выкананую дзейнасць з пазіцый самастойнасці, лёгкасці/цяжкасці;

ацэньваць сваю дзейнасць з пазіцыі ступені ўсведамлення і асваення (разумею, што трэба рабіць, добра атрымліваецца; разумею, што трэба рабіць, але яшчэ не зусім добра атрымліваецца; не зусім разумею, што трэба рабіць, не атрымліваецца);

адэкватна ацэньваць свае дасягненні, рабіць высновы аб прычынах поспехаў і няўдач.

## РАЗДЗЕЛ 2
## РАЗВІЦЦЁ ІНФАРМАЦЫЙНА-АПЕРАЦЫЙНАГА КАМПАНЕНТА ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### 2.1. Развіццё слыхавога ўспрымання

#### 2.1.1. Развіццё слыхавога ўспрымання немаўленчых гукаў

Уменні, якія фарміруюцца:

пазнаваць і дыферэнцыраваць немаўленчыя гукі (прыродныя, бытавыя, музычныя), вызначаць крыніцу гуку;

вызначаць інтэнсіўнасць гуку (ціхі-гучны, ціха-гучна);

ажыццяўляць слыхавую арыенціроўку ў прасторы: вызначаць кірунак і ступень аддаленасці, месцазнаходжанне крыніцы гуку (блізка, далёка, побач; уверсе, унізе, высока, справа, злева і да таго падобнае);

падбіраць (выбіраць) аб’екты, якія гучаць аналагічна.

2.1.2. Развіццё пачуцця рытму

Развіццё пачуцця рытму ў немаўленчым плане

Уменні, якія фарміруюцца:

ацэньваць успрыманыя рытмы з пазіцыі тоеснасці (аднолькавыя або розныя), колькасці элементаў (колькі разоў пастукаў), інтэнсіўнасці гучання (ціха-гучна);

успрымаць і ўзнаўляць рытм, прадстаўлены звёнамі з аднолькавай колькасці ударaў, рознай колькасці ударaў (серыі простых ударaў; серыі акцэнтаваных ударaў – слабыя і моцныя ўдары з кароткімі і доўгімі прамежкамі) па слыхавым узоры, маўленчай інструкцыі;

успрымаць рытм музычнай фразы, твора, узнаўляць яго (адпляскваць, адстукваць);

рухацца пад музыку ў адпаведнасці з рытмічным малюнкам, які гучыць;

маляваць, пісаць у адпаведнасці з зададзеным рытмам (напрыклад, «раз і, два і, тры і, коска» – літара ш).

Развіццё пачуцця рытму ў маўленчым плане, успрымання інтанацыі выказвання, націску

Уменні, якія фарміруюцца:

успрымаць і ўзнаўляць рытм у маўленчым плане: камбінацыі аднолькавых складоў (так-так-так; не-не-не і да таго падобныя); камбінацыі складоў, якія адрозніваюцца галосным гукам (ма-му-ме; дын-дон-дын-дон і таму падобныя); у сказе; вершы;

успрымаць і ўзнаўляць, пераймаючы, інтанацыю выказвання, націск у словах;

знаходзіць рыфмаваныя словы, падбіраць рыфмаваныя словы.

2.1.3. Развіццё фанематычнага ўспрымання

Уменні, якія фарміруюцца:

адрозніваць словы, склады, падобныя па гукавым складзе, адрозныя адным-двума гукамі або іх паслядоўнасцю (каза – каса, мышка – міска, шар – шары, кот – ток, ба – па, на – но і да таго падобнае);

дакладна ўспрымаць і выразна вылучаць маўленчыя гукі на слых;

адрозніваць на слых і ва ўласным вымаўленні гукі, падобныя па акустыка-артыкуляцыйнай прыкмеце:

галосныя:

[а] ад іншых галосных;

галосныя, якія адрозніваюцца рэзка артыкулятарна, што адлюстроўваецца пры іх зрокавым успрыманні ([і] – [у], [э] – [о], [і] – [о], [э] – [у]);

акустычна блізкія галосныя, якія не адрозніваюцца рэзка артыкулятарна ([і] – [э], [у] – [о], [ы] – [э]);

зычныя:

санорныя ([м] – [л], [м] – [р], [н] – [л], [н] – [р], [н] – [j], [м] – [j], [м] – [н], [л] – [р]);

цвёрдыя – мяккія ([н] – [н’], [м] – [м’], [б] – [б’], [д] – [дз’], [в] – [в’], [з] – [з’], [л] – [л’]);

глухія – звонкія ([п] – [б], [т] – [д], [к] – [г], [ф] – [в], [с] – [з], [ш] – [ж]);

свісцячыя – шыпячыя ([с] – [ш], [з] – [ж], [с’] – [шч]);

заднеязычныя ([г] – [к] – [х]);

афрыкаты ([ч] – [ц]);

вызначаць асноўныя прыкметы гука, характарызаваць выдзелены гук (галосны, зычны; цвёрды, мяккі; звонкі, глухі);

правільна ўспрымаць на слых і ўзнаўляць серыю маўленчых раздражняльнікаў, прытрымліваючыся іх паслядоўнасці (гукаў, складоў).

2.2. Развіццё зрокавага ўспрымання

2.2.1. Развіццё ўспрымання знешніх прыкмет прадметаў

2.2.1.1. Развіццё ўспрымання колеру

Развіццё дыферэнцыраванага ўспрымання колеру (колеры і іх адценні)

Уменні, якія фарміруюцца:

падбіраць колер да ўзору, суадносіць аб’екты па колеры;

падбіраць адценні прад’яўленага колеру;

капіраваць паслядоўнасць каляровага рада;

выбудоўваць рад колераў спектра па ўзоры;

капіраваць зададзеныя ва ўзоры колеры фігур, ліній;

ранжыраваць колеры па каляровым тоне, выбудоўваць серыяцыйныя рады адценняў колеру (рады з адценняў аднаго колеру – ад самага светлага да самага цёмнага і наадварот);

дыферэнцыраваць колеры па чысціні тону (яркі, цьмяны, празрысты, мутны і да таго падобныя);

групаваць колеры і іх адценні, прадметы па колеры (па ўзоры);

суадносіць адценні аднаго колеру з рознымі паказчыкамі велічыні (адценні сіняга – з паказчыкамі глыбіні вадаёмаў, карычневага – з паказчыкамі вышыні зямной паверхні і іншае).

Фарміраванне трывалай сувязі паміж колерам і яго слоўным абазначэннем

Уменні, якія фарміруюцца:

выбіраць колер, зададзены ў вуснай інструкцыі (назва колеру – у пасіўным слоўніку);

знаходзіць прадметы зададзенага колеру ў навакольнай прасторы;

называць прадметы зададзенага колеру (па прадстаўленні);

размяшчаць колеры, прадметы па колеры ў адпаведнасці з вуснай інструкцыяй (паслядоўнасць, месцазнаходжанне);

выбудоўваць рад колераў спектра па вуснай інструкцыі;

групаваць колеры і іх адценні, прадметы па колеры (па слове – назве колеру);

называць колеры, іх адценні (назва колеру – у актыўным слоўніку, слоўнік адпаведных якасных прыметнікаў);

выконваць аналіз узору (прадмета, набору прадметаў, фігур, ліній) з пазіцыі называння колеру, яго кампанентаў-складнікаў (частак);

называць паслядоўнасць колераў спектра.

2.2.1.2. Развіццё ўспрымання формы

Развіццё дыферэнцыраванага ўспрымання формы

Уменні, якія фарміруюцца:

адрозніваць эталоны формы, падбіраць форму да ўзору;

суадносіць форму прадмета з прад'яўленым эталонам формы;

вылучаць у навакольнай прасторы прадметы, адпаведныя прад'яўленай форме (напрыклад, прамавугольнік – шафа, стол, акно);

узнаўляць зададзеную форму рознымі спосабамі (выразаць, намаляваць, пабудаваць, вылепіць, выкласці і іншае);

капіраваць паслядоўнасць геаметрычных фігур (з паступовым ускладненнем узору: фігуры рознай велічыні, рознага колеру);

групаваць геаметрычныя фігуры, прадметы па форме (па ўзоры);

капіраваць размяшчэнне геаметрычных фігур на плоскасці аркуша, іх узаемаразмяшчэнне адносна адзін аднаго.

Фарміраванне трывалай сувязі паміж формай і яе слоўным абазначэннем

Уменні, якія фарміруюцца:

выбіраць форму, зададзеную ў вуснай інструкцыі (назва формы – у пасіўным слоўніку);

знаходзіць у навакольнай прасторы прадметы пэўнай формы (круглы – мяч, яблык, кола і гэтак далей);

называць прадметы зададзенай формы (па прадстаўленні);

размяшчаць геаметрычныя фігуры, прадметы рознай формы ў адпаведнасці з вуснай інструкцыяй (паслядоўнасць, месцазнаходжанне);

групаваць геаметрычныя фігуры, прадметы па форме (па слове – назве эталона формы);

называць эталоны формы (назва формы – у актыўным слоўніку, слоўнік адпаведных якасных прыметнікаў).

2.2.1.3. Развіццё ўспрымання велічыні (доўгі-кароткі; тонкі-тоўсты; шырокі-вузкі; высокі-нізкі; глыбокі-мелкі)

Уменні, якія фарміруюцца:

паказваць прадметы з зададзенымі прыкметамі велічыні (назва прыкметы велічыні – у пасіўным слоўніку);

выбіраць прадметы з дзвюма зададзенымі прыкметамі велічыні (пакажы доўгі тоўсты аловак; ... самы шырокі і глыбокі ручай і да таго падобнае);

выбудоўваць серыяцыйныя рады па прыкмеце велічыні (з паступовым павелічэннем колькасці аб’ектаў у радзе);

параўноўваць прадметы па велічыні (даўжэй-карацей і да таго падобнае);

выконваць дзеянні па змене характарыстыкі велічыні (павялічыць-паменшыць: надтачыць, пакараціць, пашырыць, звузіць і іншыя);

называць прыкметы велічыні (назва прыкметы велічыні – у актыўным слоўніку).

2.2.2. Развіццё ўспрымання прадметаў

Уменні, якія фарміруюцца:

распазнаваць прадметы на стылізаваных выявах: сілуэтных, контурных, схематычных;

распазнаваць прадметы на зашумленых выявах (якія перакрываюць адна адну, перакрэсленых);

распазнаваць прадметы на выявах з няпоўным сілуэтам, з адсутнымі часткамі (дэталямі), па палове сіметрычнага малюнка;

распазнаваць прадмет, які пададзены ў нязвыклым ракурсе;

ідэнтыфікаваць індывідуалізаваныя выявы («знайдзі такі ж самы малюнак, як гэты»);

планамерна разглядаць прадмет / малюнак прадмета, вылучаючы і называючы яго часткі, сістэму знешніх прыкмет прадмета, яго частак (колер, форма, велічыня);

распазнаваць прадметы па апісанні (распазнаванне прадмета па сістэме яго знешніх прыкмет);

злучаць асобныя дэталі ў адзіны, цэласны вобраз прадмета:

складаць прадметную карцінку (рэалістычная, сілуэтная, контурная выява прадмета) у паступова ўскладняючых умовах ўспрымання (павелічэнне колькасці частак, з якіх трэба скласці малюначак; ускладненне варыянтаў разразання карцінкі: тры роўныя часткі (уздоўж малюнка або

папярок яго), чатыры роўныя часткі (гарызанталь-вертыкаль), чатыры няроўныя часткі, чатыры часткі, разрэзаныя па дыяганалі, пяць няроўных частак і гэтак далей; складанне па ўзоры, па уяўленні; складанне з гатовага набору частак; складанне з выбарам неабходных частак);

складаць малюнак прадмета з частак (па ўзоры з гатовага набору частак; па ўзоры з самастойным адборам неабходных частак; па ўяўленні з гатовага набору яго частак; па ўяўленні з самастойным адборам неабходных частак).

2.2.3. Развіццё ўспрымання твараў

Уменні, якія фарміруюцца:

ідэнтыфікаваць знаёмыя, незнаёмыя твары на малюнках, фотаздымках;

вызначаць эмацыянальны стан чалавека па выразе твару;

вызначаць эмацыянальны стан персанажаў на сюжэтным малюнку, выкарыстоўваючы адпаведную лексіку (вясёлы, сумны, злы, …; спужаны, засмучаны, …; радуецца, злуецца, баіцца, …) у камунікатыўных выказваннях.

2.2.4. Развіццё ўспрымання складаных выяў (сюжэтных малюнкаў)

Уменні, якія фарміруюцца:

вызначаць намаляваную падзею, сітуацыю, вылучаць галоўныя і другарадныя аб’екты намаляванай сітуацыі, асноўнае і фонавае;

параўноўваць сюжэтныя карцінкі, знаходзіць прыкметы падабенства і адрознення на падобных, але не тоесных малюнках;

злучаць асобныя дэталі ў адзіную сэнсавую карціну: складаць сюжэтную карцінку з гатовага набору яе частак, з самастойным адборам неабходных частак (па ўзоры, па прадстаўленні);

выкладваць у лагічнай паслядоўнасці серыю сюжэтных малюнкаў;

вылучаць сюжэтныя карцінкі, якія адносяцца да адной і той жа падзеі («разблытаць» дзве падзеі – малюнкі дзвюх серый сюжэтных малюнкаў).

2.2.5. Развіццё ўспрымання сімвалаў

Развіццё дыферэнцыраванага ўспрымання асобных графічных аб’ектаў (знакаў, сімвалаў), іх зрокавы аналіз, сінтэз

Уменні, якія фарміруюцца:

дыферэнцыраваць графічныя знакі, сімвалы (+, –, =, →, ↑, >, <, ∧, ∨, !, ? і іншыя), адрозніваць аптычна падобныя выявы (з паступовым памяншэннем адрозненняў паміж успрымаемымі сімваламі);

выконваць зрокавы аналіз літар, лічбаў (друкаваных, рукапісных): вылучаць і характарызаваць складовыя элементы (колькасць элементаў, іх форму, велічыню, прасторавае размяшчэнне адносна адзін аднаго і на аркушы);

распазнаваць літары, лічбы (друкаваныя, рукапісныя) па характэрных дэталях;

знаходзіць літару, лічбу і іншыя знакі сярод падобных літар, лічбаў, знакаў, дыферэнцыраваць падобныя літары, лічбы (друкаваныя, рукапісныя) па сэнсаадрозных прыкметах (колькасць элементаў, іх форма, прасторавае размяшчэнне);

распазнаваць літару, лічбу ў змененых умовах (незалежна ад велічыні, прасторавага размяшчэння, шрыфту);

распазнаваць літары, лічбы (друкаваныя, рукапісныя) на зашумленых, накладзеных адна на адну выявах;

выконваць зрокавы сінтэз літар, лічбаў і іншых знакаў; канструяваць літары, лічбы з дэталяў;

пераўтвараць адну літару (лічбу) у іншую (друкаваныя, рукапісныя);

выконваць зрокавы аналіз шэрагу аднародных графічных аб’ектаў (напрыклад, вылучэнне і распазнаванне кожнай літары ў складзе);

выконваць зрокавы сінтэз шэрагу аднародных графічных аб’ектаў (напрыклад, аб’яднанне ўспрынятага па частках у адзінае сінтэтычнае цэлае – склад);

выконваць параўнанне графічных аб’ектаў: вызначаць наяўнасць або адсутнасць тоеснасці (аднолькавыя, розныя), знаходзіць агульныя і адметныя дэталі;

групаваць графічныя аб’екты па прыкметах колькасці элементаў, формы элементаў, прасторавага размяшчэння элементаў.

Развіццё цэласнага ўспрымання групы графічных аб’ектаў (складоў, слоў, лічбаў), зрокавы аналіз, сінтэз

Уменні, якія фарміруюцца:

распазнаваць групы графічных знакаў (складоў, слоў, лічбаў) як цэласныя аб’екты;

выконваць зрокавы складовы аналіз слова (вылучэнне і распазнаванне кожнага склада, іх колькасці і паслядоўнасці);

адрозніваць падобныя рады графічных знакаў (склады з 2–4 літар, колькасці), адрозныя парадкам следавання элементаў або 1–2 элементамі;

выконваць зрокавы сінтэз рада складоў (аб’яднанне ўспрынятага па частках у адзінае сінтэтычнае цэлае – слова);

аб’ядноўваць рад успрынятых слоў у сінтэтычнае цэлае – словазлучэнне.

2.3. Развіццё прасторавай арыенціроўкі

2.3.1. Развіццё прасторавай арыенціроўкі ў схеме цела

2.3.1.1. Развіццё прасторавай арыенціроўкі ў схеме ўласнага цела

Уменні, якія фарміруюцца:

аналізаваць часткі твару і іх размяшчэнне ў адносінах адзін да аднаго (вышэй за ўсё; ніжэй за ўсё; вышэй за; ніжэй за; над, пад, збоку ад, пасярэдзіне, па цэнтры, у цэнтры);

аналізаваць размяшчэнне частак ўласнага цела па вертыкальнай восі (над, пад; вышэй за; ніжэй за);

аналізаваць схему ўласнага цела па гарызантальнай восі (спераду – твар, жывот, грудзі; ззаду – патыліца, спіна, пяткі);

аналізаваць размяшчэнне частак уласнага цела па восі права-левай арыенціроўкі (правая – левая рука, нага, вока, вуха і іншае);

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры арыенціроўцы ў схеме цела па вертыкальнай восі, гарызантальнай восі, восі права-левай арыенціроўкі.

2.3.1.2. Развіццё прасторавай арыенціроўкі ў схеме цела чалавека, які стаіць насупраць

Уменні, якія фарміруюцца:

паказваць на сабе і на чалавеку, які стаіць насупраць, названыя часткі цела з улікам права-левай арыенціроўкі (правую руку, левае вока і да таго падобнае);

называць часткі цела, якія паказвае на сабе чалавек, які стаіць насупраць, з улікам права-левай арыенціроўкі (правая рука, левая нага і да таго падобнае);

вызначаць на малюнках, якой рукой дзейнічае персанаж, з якога боку адносна іншых знаходзіцца кожны персанаж, у якой руцэ і што ён трымае і да таго падобнае.

2.3.2. Развіццё арыенціроўкі ў трохмернай прасторы

2.3.2.1. Развіццё арыенціроўкі ў размяшчэнні аб’ектаў адносна ўласнага цела

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца (паказ) у размяшчэнні аб’ектаў адносна ўласнага цела (што знаходзіцца над, пад, уверсе, унізе; перад, за, спераду, ззаду; справа, злева; лявей, правей; побач, блізка, далёка, бліжэй, далей);

размяшчаць аб’екты ў зададзеным месцазнаходжанні адносна ўласнага цела;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры ўказанні на размяшчэнне аб’ектаў адносна ўласнага цела.

2.3.2.2. Развіццё арыенціроўкі ў напрамках у прасторы адносна ўласнага цела

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца (паказ) у напрамках у прасторы адносна ўласнага цела (уверх,уніз, наперад, назад, направа, налева);

рухацца ў зададзеным кірунку (наперад, назад; направа, налева; насустрач адзін аднаму; у адным кірунку; у процілеглым кірунку);

рухацца ў трохмернай прасторы па зададзенай траекторыі;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры ўказанні на напрамкі перамяшчэння адносна ўласнага цела.

2.3.2.3. Развіццё арыенціроўкі ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў, у напрамках руху аб’ектаў адносна адзін аднаго

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў адзін адносна аднаго (паказваць аб’екты з зададзеным узаемаразмяшчэннем адзін адносна аднаго) (вышэй, ніжэй, на, над, пад, знізу, зверху, паміж; бліжэй да, далей ад, паміж, перад (чым-небудзь), за (чым-небудзь), спераду ад, ззаду ад; злева, справа, лявей, правей);

усталёўваць аддаленасць аб’ектаў (далёка-блізка, далей, бліжэй; побач);

размяшчаць аб’екты ў трохмернай прасторы па інструкцыі, у якой з дапамогай прыназоўнікаў і прыслоўяў месца выяўляюцца прасторавыя адносіны («пакладзі ручку пад кнігу» і да таго падобнае);

перамяшчаць аб’екты ў прасторы ў зададзеных кірунках;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры ўказанні на ўзаемаразмяшчэнне аб’ектаў, напрамкі руху аб’ектаў адзін адносна аднаго;

арыентавацца ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў, адлюстраваных у пасіўных маўленчых прасторавых канструкцыях (перад скрыняй бочачка; пад бочачкай скрыня; абрусам накрыты стол).

2.3.2.4. Развіццё арыенціроўкі ў лінейнай паслядоўнасці рада, ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў пры зададзеным кірунку

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць прасторавы аналіз узаемаразмяшчэння аб’ектаў у радзе, калоне пры зададзеным кірунку (да, пасля, перад, за; першы, апошні, бліжэй за ўсё да, далей за ўсё ад, перадапошні, наступны за, папярэдні і да таго падобнае); выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці;

выконваць пастраенне ў радзе, калоне па зададзеным ўзаемаразмяшчэнні.

2.3.3. Развіццё арыенціроўкі ў двухмернай прасторы

2.3.3.1. Развіццё арыенціроўкі па баках аркуша

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца на прасторы аркуша:

простая арыенціроўка (верх, ніз; правы, левы бок; цэнтр, сярэдзіна аркуша);

складаная арыенціроўка:

верхні левы вугал, ніжні правы вугал і да таго падобнае;

вертыкаль, гарызанталь, дыяганаль;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры арыенціроўцы на прасторы аркуша.

2.3.3.2. Развіццё арыенціроўкі ў прасторавых адносінах аб’ектаў і ўласнага цела на плоскасці аркуша

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца ў размяшчэнні аб’ектаў адносна ўласнага цела ў двухмернай прасторы, размяшчаць аб’екты ў зададзенай пазіцыі на плоскасці аркуша:

уверсе, унізе; справа, злева; у цэнтры, пасярэдзіне ліста;

у верхнім левым вуглу і да таго падобнае;

у слупок;

у радку злева направа;

па вертыкалі (вертыкальна); па гарызанталі (гарызантальна); па дыяганалі;

арыентавацца ў тэксце на старонцы:

уверсе, унізе;

правы слупок (складоў, слоў), левы слупок;

верхні рад (радок), ніжні рад (радок);

над – пад гэтым словам (малюнкам, радком);

першы, другі, …, апошні; наступны (радок, сказ і іншае);

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры арыенціроўцы ў прасторавых адносінах аб’ектаў і ўласнага цела.

2.3.3.3. Развіццё арыенціроўкі ў напрамках у прасторы на плоскасці аркуша

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца ў напрамках, праводзіць лініі ў зададзеным кірунку:

уверх, уніз, направа, налева;

зверху ўніз, знізу ўверх; злева направа, справа налева;

направа ўверх, направа ўніз;

у тым жа кірунку (у той жа бок), у процілеглым кірунку (у адваротны бок), насустрач, да цэнтра;

паралельна;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці пры арыенціроўцы ў напрамках у прасторы на плоскасці аркуша.

2.3.3.4. Развіццё арыенціроўкі ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў на плоскасці аркуша

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў на плоскасці аркуша (паказваць на малюнках выявы прадметаў з зададзеным ўзаемаразмяшчэннем адносна адзін аднаго):

вышэй, ніжэй, на, над, пад, знізу, зверху, паміж;

бліжэй да, далей ад, паміж;

перад (чым-небудзь), за (чым-небудзь);

злева ад, справа ад, лявей, правей;

сіметрычна;

выконваць інструкцыю, у якой з дапамогай прыназоўнікаў і прыслоўяў месца выяўляюцца прасторавыя адносіны («пакладзі трохвугольнік паміж кругам і квадратам», «пастаў кропку пад трохвугольнікам», «намалюй кружочак перад квадратам» і да таго падобнае);

знаходзіць сярод малюнкаў такі, на якім намаляваны прасторавыя адносіны паміж прадметамі, выказаныя зададзенай вербальнай формай («паказаць бочку за скрыняй» і да таго падобнае);

канструяваць плоскасныя аб’екты з частак з зададзеным іх узаемаразмяшчэннем;

суадносіць рэальную прастору з яе планам, арыентавацца ў плане памяшкання, двара;

складаць план памяшкання, двара; распазнаваць прасторавыя прыназоўнікі і паняцці, схематычна намаляваныя на малюнках (на, над, пад, перад, за, побач, каля, злева ад, справа ад; на, з, пад, з-пад, у, да, ад, за, з-за); самастойна паказваць на малюнку прасторавыя прыназоўнікі і паняцці, якія адлюстроўваюць узаемаразмяшчэнне прадметаў і рух у пэўным кірунку;

арыентавацца ў графічных схемах, табліцах.

2.3.3.5. Развіццё арыенціроўкі ў лінейнай паслядоўнасці радка, ва ўзаемаразмяшчэнні аб’ектаў на плоскасці аркуша пры зададзеным кірунку

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць прасторавы аналіз узаемаразмяшчэння аб’ектаў у радзе (прадметы на малюнку, літары ў складзе, склады ў слове, словы ў сказе, лічбы ў радзе і іншае):

да, пасля, перад, за;

паміж;

першы, другі, …, апошні;

бліжэй усяго да, далей усяго ад;

перадапошні, наступны за, папярэдні і таму падобнае;

выкарыстоўваць у маўленні адпаведныя прасторавыя прыназоўнікі і паняцці.

2.4. Развіццё арыенціроўкі ў часе

2.4.1. Развіццё ўспрымання часу (пачуцця часу), фарміраванне ўяўленняў аб часавай працягласці

Уменні, якія фарміруюцца:

арыентавацца ў працягласці часавых інтэрвалаў (раніца, дзень, тыдзень, месяц, год, паўгода, стагоддзе; гадзіна, хвіліна, секунда і іншыя), параўноўваць іх паміж сабой (што даўжэй, што карацей), (што даўжэй: дзень або тыдзень; што карацей; што доўжыцца менш і да таго падобнае), выкарыстоўваць адпаведныя маўленчыя канструкцыі;

суадносіць часавы адрэзак са зместам і аб'ёмам дзейнасці (што можна зрабіць за гадзіну; ці можна зрабіць за дзень і да таго падобнае);

арыентавацца ў колькасных характарыстыках мер часу (у сутках – чатыры часткі, у тыдні – сем дзён, у месяцы – чатыры тыдні, дванаццаць месяцаў – год, шэсць месяцаў – паўгода і іншае).

2.4.2. Развіццё арыенціроўкі ў часавай паслядоўнасці

Уменні, якія фарміруюцца:

устанаўліваць паслядоўнасць, узнаўляць часавыя радкі (часткі сутак; поры года; дні тыдня; месяцы года);

арыентавацца ў часавых адносінах (сёння, учора, заўтра; пазаўчора, паслязаўтра; на наступны дзень; даўно, нядаўна, хутка; праз дзень, тыдзень, месяц, год);

устанаўліваць часавыя адносіны: цяперашнія (адбываюцца цяпер), прошлыя (адбываліся раней), будучыя (яшчэ адбудуцца);

арыентавацца ў парадкава-часавых адносінах у радзе падзей (цяпер, зараз, потым; да, пасля; перад, за; спачатку, потым; рана, позна, раней, пазней);

устанаўліваць парадак следавання эпізодаў аповеду, казкі;

устанаўліваць паслядоўнасць пераўтварэння аб'екта ў працэсе дзейнасці (прадуктыўнай, працоўнай і іншай) (маляванне, лепка прадмета, гатаванне ежы і іншае);

адрозніваць паняцці «ў мінулым годзе», «у гэтым годзе», «у будучым годзе»;

вызначаць час па гадзінніку;

арыентавацца ў часе па календары (вызначаць, колькі дзён прайшло з пачатку тыдня, пачатку месяца, колькі месяцаў прайшло з пачатку года, колькі засталося да канца года, якога чысла пачынаецца новы год, які дзень тыдня быў 1 студзеня, колькі дзён (тыдняў, месяцаў) засталося да падзей, якія цікавяць, і гэтак далей);

вызначаць дату (чысло, месяц, год).

2.4.3. Развіццё арыенціроўкі ва ўзросце людзей

Уменні, якія фарміруюцца:

называць свой узрост;

вызначаць свой узрост у цяперашнім, а таксама ў мінулым, будучым годзе;

арыентавацца ва ўзросце людзей (дзіця, дарослы; немаўля, дзіця, падлетак, юнак, дзяўчына, мужчына, жанчына, пажылы чалавек, стары);

устанаўліваць адносіны «старэй – маладзей» у адпаведнасці з датай нараджэння (хто нарадзіўся раней, той старэйшы);

устанаўліваць адноснасць у роднасных сувязях, адносінах: адзін і той жа чалавек можа быць адначасова і сынам, і братам, і ўнукам.

2.5. Развіццё колькасных уяўленняў

2.5.1. Развіццё ўяўленняў аб колькаснай прыкмеце аб’ектаў і аб колькасных адносінах паміж мноствамі аб’ектаў

Уменні, якія фарміруюцца:

вылучаць колькасную прыкмету аб’ектаў, абстрагуючыся ад іншых іх прыкмет (велічыні, прасторавага размяшчэння);

устанаўліваць колькасныя адносіны пры параўнанні двух мностваў (адзін – многа, многа – мала, аднолькава – столькі ж – пароўну, больш – менш);

устанаўліваць узаемна адназначную адпаведнасць паміж мноствамі (шляхам складання пар, злучэння стрэлкамі, выкарыстання мноства-пасярэдніка, ліку).

2.5.2. Развіццё ўменняў аперыраваць мноствамі

Уменні, якія фарміруюцца:

ператвараць мноствы, якія змяняюць колькасць элементаў: павелічэнне, памяншэнне і ўраўноўванне мностваў (разуменне колькаснага складу мноства і магчымасці яго змены);

ператвараць мноствы (розныя па колеры, форме, велічыні, адлегласці паміж прадметамі, размяшчэнні ў прасторы і іншыя), якія захоўваюць колькасць элементаў (засваенне ўяўленняў аб захаванні колькасці);

ствараць раўналікія мноствы;

дзяліць мноства на часткі (роўныя, няроўныя).

2.6. Развіццё кінестэтычнага ўспрымання, рухальнай сферы тонкіх рухаў

2.6.1. Развіццё кінестэтычнага ўспрымання на ўзроўні артыкуляцыі, развіццё артыкуляцыйнай маторыкі

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць паўнавартасныя, дыферэнцыраваныя рухі і палажэнні органаў артыкуляцыйнага апарату, неабходныя для правільнага, выразнага вымаўлення гукаў; выконваць артыкуляцыйныя рухі па ўзоры, вуснай інструкцыі (з апорай на зрокавы самакантроль з дапамогай люстэрка, апорай толькі на кінестэтычны самакантроль);

выконваць плаўны пераход (пераключэнне) да іншага руху і становішча;

выразна артыкуляваць пры вымаўленні гукі, апісваць асаблівасці маўленчых рухаў пры вымаўленні гука;

дыферэнцыраваць пры вымаўленні артыкуляцыйна блізкія гукі, склады з гэтымі гукамі;

выразна артыкуляваць і вымаўляць зададзеныя гукі, рады гукаў (пераключэнне з адной артыкулемы на іншую);

злучна вымаўляць радкі гукаў (склады);

выразна вымаўляць (паўтараць) серыі з 3–4 складоў з акустычна і артыкуляцыйна блізкімі гукамі;

дыферэнцыраваць пры вымаўленні гукі ў складаных спалучэннях зычных гукаў (у словах пры збегу зычных);

правільна вымаўляць словы, словазлучэнні, якія змяшчаюць гукі, блізкія па артыкуляцыі.

2.6.2. Развіццё кінестэтычнага ўспрымання на ўзроўні рухаў рук, развіццё дробнай маторыкі рук

2.6.2.1. Умацаванне мышцаў кісцяў рук, развіццё рухомасці, сілы і гнуткасці пальцаў і запясця

Уменні, якія фарміруюцца (з апорай на зрокавы і кінестэтычны самакантроль):

напружваць – расслабляць пальцы, сціскаць – расціскаць кулачкі;

згінаць – разгінаць, выгінаць пальцы, вярцець, варочаць пальцамі;

згінаць рукі ў запясці, варочанне ўправа-ўлева, круціць рукой у запясці і іншае.

2.6.2.2. Развіццё каардынацыі рухаў пальцаў і кісцяў рук

Развіццё статычнай каардынацыі рухаў

Уменні, якія фарміруюцца:

утрымліваць пальцы, кісць рукі ў пэўным статычным становішчы («кошка», «каза», «кола», «гусь» і да таго падобнае);

утрымліваць статычныя позы абедзвюма рукамі адначасова.

Развіццё дынамічнай каардынацыі рухаў

Уменні, якія фарміруюцца:

плаўна пераключацца з аднаго руху пальцаў, кісці рукі на іншы («гульня на піяніна», «пальчыкі вітаюцца», «пафарбуем плот», «пагладзім кацяня» і да таго падобнае);

выконваць рухі дзвюма рукамі адначасова.

Развіццё рытмічнай каардынацыі рухаў

Уменні, якія фарміруюцца:

рытмічна ажыццяўляць пераходы з адной статычнай позы ў іншую («далонь – кулак» і да таго падобнае);

выконваць рухі дзвюма рукамі адначасова сінхронна, асінхронна.

2.6.2.3. Развіццё базавых графічных уменняў

Уменні, якія фарміруюцца:

размалёўваць малюнак з захаваннем яго контуру;

абводзіць трафарэты, шаблоны, малюнкі па контуры;

маляваць прамыя і хвалістыя лініі, кругі і авалы;

штрыхаваць фігуры прамымі лініямі ў асноўных і дыяганальных кірунках.

2.7. Развіццё інтэгратыўных функцый

2.7.1. Развіццё каардынацыі ў сістэме «вока – рука» (зрокава-рухальная інтэграцыя)

Уменні, якія фарміруюцца:

праводзіць лінію дакладна па контуры малюнка;

праводзіць лініі зададзенай формы («дарожкі»);

капіраваць графічны ўзор з паступовым выдаленнем яго ад вачэй да размяшчэння на дошцы: лініі («палачкі»), розныя па даўжыні, вышыні, колеры; геаметрычныя фігуры, іх рады; літары, склады і іншае;

маляваць па кропках, злучаць кропкі прамымі лініямі;

маляваць па клетачках;

прайграваць графічныя праграмы на аснове ўстанаўлення заканамернасці ў графічным радзе.

2.7.2. Развіццё каардынацыі ў сістэме «вуха – рука» (слыха-рухальная інтэграцыя)

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць па вуснай інструкцыі асобныя графічныя дзеянні, серыі дзеянняў – рухальныя праграмы.

2.7.3. Развіццё каардынацыі паміж зрокавым, слыхавым і кінестэтычным успрыманнем

Уменні, якія фарміруюцца:

рэалізоўваць узаемасувязь паміж акустычным, маўленчарухальным і зрокавым вобразамі: фанема – артыкулема – графема (аналагічна на ўзроўні склада, слова);

рэалізоўваць узаемасувязь паміж акустычным, маўленчарухальным, зрокавым і рухальным вобразамі: фанема – артыкулема – графема – кінема.

2.8. Развіццё мыслення

2.8.1. Развіццё ўніверсальных разумовых аперацый; фарміраванне ўменняў, якія вызначаюць прадуктыўнасць работы з аб’ектамі і паняццямі

Уменні, якія фарміруюцца:

мысленна вылучаць у аб’ектах рознага віду (адушаўлёныя і неадушаўлёныя прадметы, з’явы, літары, словы, сказы, лічбы, лікі, фігуры і іншае) іх прыкметы;

планамерна, у пэўнай лагічнай паслядоўнасці ажыццяўляць аналіз аб’екта, вылучаючы яго складовыя часткі і / або характэрныя прыкметы;

мысленна злучаць у адзінае цэлае часткі аб’екта або яго прыкметы, атрыманыя ў працэсе аналізу (ажыццяўляць сінтэз);

вылучаць у адным аб’екце розныя прыкметы; адной і той жа прыкметы – у розных аб’ектах;

ажыццяўляць мадэляванне: выкарыстоўваць наглядныя мадэлі, якія абазначаюць рэальныя прадметы, іх прыкметы; ствараць схематычныя выявы прадметаў;

указваць аб’екты, якія валодаюць зададзенай прыкметай (сукупнасцю дзвюх, трох прыкмет);

вызначаць тоеснасць аб’ектаў па сваіх прыкметах або яе адсутнасць (аднолькавыя або розныя);

параўноўваць аб’екты па якасных характарыстыках той ці іншай прыкметы (колеры, форме і іншае), па колькасных характарыстыках (больш-менш, даўжэй-карацей, вышэй-ніжэй і гэтак далей);

устанаўліваць аднолькавыя (агульныя) і адметныя прыкметы аб’ектаў (чым падобныя і чым адрозніваюцца), ступень падабенства (чым больш аднолькавых прыкмет, тым больш аб’екты падобныя); дыферэнцыраваць паняцці «аднолькавыя» і «падобныя»;

падбіраць аб’екты, супрацьлеглыя па сваіх прыкметах;

размяшчаць аб’екты ў пэўнай паслядоўнасці з улікам ступені праяўлення той ці іншай прыкметы (даўжыні, таўшчыні, колеру, павелічэння або змяншэння колькасці і іншае), ажыццяўляць серыяцыю;

адрозніваць у аб’ектах істотныя (важныя) прыкметы з пункту гледжання пэўнага паняцця ад прыкмет неістотных (няважных), другарадных;

выводзіць паняцце, якое адлюстроўвае істотныя прыкметы аб’ектаў дадзенага класа (ажыццяўляць абагульненне);

складаць апісанне зададзенага аб’екта;

распазнаваць аб’екты па іх апісаннях;

выводзіць следствы з факта прыналежнасці аб’екта да дадзенага паняцця, адрозніваць прыкметы неабходныя і дастатковыя;

выконваць дзеянне падвядзення пад паняцце (усталяванне наяўнасці ў аб’екта прыкмет гэтага паняцця):

дыферэнцыраваць сэнс злучнікаў-звязак «і», «або»;

дыферэнцыраваць паняцці: «некаторыя», «кожны», «усе», «асобныя», «частка»;

вылучаць лагічную структуру азначэнняў паняццяў, правілы іх пабудовы;

вылучаць неабходныя і адначасова дастатковыя прыкметы аб'ектаў у вызначэнні паняццяў;

аналізаваць гатовыя вызначэнні з пункту гледжання іх правільнасці (адпаведнасці правілам пабудовы);

складаць, фармуляваць азначэнні паняццяў на аснове абагульнення істотных прыкмет, уласцівых шэрагу аднародных аб'ектаў;

размяркоўваць аб'екты па групах (ажыццяўляць класіфікацыю) па зададзенай падставе (прыкмеце);

класіфікаваць аб'екты па адной, дзвюх, трох агульных прыкметах;

вызначаць падставу прапанаванай класіфікацыі аб'ектаў;

класіфікаваць сукупнасць аб'ектаў па самастойна знойдзенай падставе, указваць на яе;

класіфікаваць сукупнасць аб'ектаў па розных падставах;

уключаць аб'ект у розныя сістэмы абагульненняў (адзін і той жа аб'ект разглядаецца з розных бакоў);

аб'ядноўваць аб'екты ў класы і вылучаць падкласы;

выконваць шматступеньчатыя (іерархічныя) класіфікацыі як спосаб сістэматызацыі (упарадкавання сукупнасці аб'ектаў) знаёмай сукупнасці аб'ектаў;

выконваць серыяцыю (аб'яднанне аб'ектаў у адзін рад па меры змяншэння або ўзрастання ступені праяўлення прыкметы) як спосаб сістэматызацыі;

сістэматызаваць паняцці ад больш агульнага да больш прыватнага;

вызначаць прынцып, па якім складзена табліца; запаўняць табліцу;

сістэматызаваць матэрыял, запаўняючы табліцу, складаючы схему, з дапамогай граф і таму падобнага;

прадстаўляць інфармацыю рознымі спосабамі (у схеме, табліцы).

2.8.2. Развіццё ўменняў устанаўліваць (вызначаць) адносіны паміж аб'ектамі, паняццямі

Уменні, якія фарміруюцца:

устанаўліваць адносіны: частка – цэлае, цэлае – частка;

устанаўліваць адносіны: від – род, род – від;

устанаўліваць функцыянальныя адносіны;

устанаўліваць адносіны: агульнае – прыватнае; агульнае – зборнае – адзінкавае паняцце;

устанаўліваць адносіны паміж аб'ёмамі паняццяў:

сумесных паняццяў (элементы аб'ёму аднаго паняцця часткова або цалкам належаць аб'ёму іншага паняцця): адносіны раўназначнасці, перасячэння, падпарадкавання;

несумяшчальных паняццяў (ні адзін элемент аб’ёму аднаго паняцця не належыць аб’ёму іншага паняцця): адносіны супадпарадкавання трэцяга, супярэчнасці, супрацьлегласці;

устанаўліваць іерархію паняццяў: ад больш агульнага да больш прыватнага;

ранжыраваць паняцці па вызначанай падставе (напрыклад, немаўля – хлопчык – юнак – мужчына – стары; крычаць – казаць – шаптаць – маўчаць і іншае);

устанаўліваць адносіны: прычына – следства;

размяжоўваць паняцці «прычына» і «ўмовы»;

устанаўліваць часавыя адносіны, адносіны паслядоўнасці (у радзе аб’ектаў, падзей);

устанаўліваць заканамернасць у радзе аб’ектаў (прынцып, па якім сукупнасць аб’ектаў размяшчаецца ў рад), працягваць рад;

устанаўліваць аналогіі;

устанаўліваць роўнасць-няроўнасць двух аб’ектаў, велічынь, мностваў, паняццяў;

устанаўліваць лагічныя залежнасці паміж аб’ектамі сітуацыі, абстрагуючыся ад знешніх прыкмет (іх размяшчэнне, велічыня, маўленчае афармленне і іншае).

2.8.3. Фарміраванне ўменняў разважаць: выказваць меркаванні, якія адлюстроўваюць сувязь паміж двума паняццямі, рабіць высновы, прыводзіць найпрасцейшыя доказы

Уменні, якія фарміруюцца:

адрозніваць віды меркаванняў: станоўчыя/сцвярджальныя (аб’екту прыпісваецца якая-небудзь прыкмета ці што-небудзь сцвярджаецца) і адмоўныя (гаворыцца, што якой-небудзь прыкметы ў аб’екце няма або што-небудзь адмаўляецца); агульныя (гаворыцца пра ўсе аб’екты, якія пазначаюцца дадзеным паняццем) і прыватныя (гаворыцца пра частку аб’ектаў, якія пазначаюцца дадзеным паняццем);

выказваць агульныя і прыватныя сцвярджальныя меркаванні (выкарыстанне слоў: усе, усялякі, ...; некаторыя, частка, большасць, …);

выказваць агульныя і прыватныя адмоўныя меркаванні (выкарыстанне слоў: ні адзін, ніхто, …; не ўсе, некаторыя … не .., …);

выводзіць непасрэдныя высновы з меркавання (Усе матылькі маюць крылы (меркаванне). Ні адзін з матылькоў не з’яўляецца бяскрылым (выснова));

выказваць высновы, выкарыстоўваючы словы: значыць, такім чынам, калі ..., то …;

рабіць высновы;

вызначаць правільнасць/няправільнасць разваг (высноў);

даказваць з дапамогай прыкладаў правільнасць/няправільнасць сцвярджэнняў.

2.9. Развіццё ўяўлення

2.9.1. Развіццё ўзнаўляльнага ўяўлення

Уменні, якія фарміруюцца:

дабудоўваць вобразы знаёмых прадметаў па элементах (кропках, частках прадмета);

завяршаць вядомыя словы, фразы (па пачатку);

вылучаць вобраз прадмета сярод іншых і аднаўляць яго ў малюнку (распазнаць прадметы на «зашумленай» выяве і намаляваць іх);

вызначаць прадметы, падобныя па форме на зададзеныя геаметрычныя фігуры, і іншае.

2.9.2. Развіццё творчага ўяўлення (пабудова і рэалізацыя ўласных планаў-задум)

Уменні, якія фарміруюцца:

ствараць на аснове адных і тых жа зыходных матэрыялаў розныя вобразы;

ствараць адзін і той жа вобраз з розных матэрыялаў, рознымі спосабамі;

працягнуць (завяршыць аповед);

прыдумаць пачатак гісторыі;

прыдумаць гісторыю (на аснове апорных малюнкаў, слоў, на тэму) і іншае.

2.10. Развіццё памяці

2.10.1. Фарміраванне ўменняў запамінаць і ўзнаўляць інфармацыю на аснове выкарыстання мнемічных апор

Уменні, якія фарміруюцца:

выкарыстоўваць для запамінання і ўзнаўлення інфармацыі прыёмы стварэння знешніх апор (падлік колькасці элементаў інфармацыі, устанаўленне асацыяцый, мнемасхема і іншыя);

выкарыстоўваць для запамінання і ўзнаўлення інфармацыі прыёмы стварэння сэнсавых апор (класіфікацыя, вылучэнне апорных пунктаў, складанне з іх мнемічнага плана (пры запамінанні тэксту), піктаграма, мнемадарожка, мнематабліца, дабудоўванне матэрыялу, аналогія, схематызацыя і іншыя).

2.10.2. Развіццё ўменняў мэтанакіравана запамінаць і прайграваць матэрыял розных мадальнасцей, выкарыстоўваючы розныя мнемічныя прыёмы

Уменні, якія фарміруюцца:

запамінаць і прайграваць размяшчэнне прадметаў у прасторы (у памяшканні класа, на плоскасці стала, на паліцы, у радзе);

запамінаць і прайграваць рад прадметаў, прадметных малюнкаў;

запамінаць і прайграваць рад сімвалаў (літар, лічбаў, знакаў);

запамінаць і прайграваць змест арганізаванай па сэнсе зрокавай інфармацыі – сюжэтнай карцінцы;

запамінаць і прайграваць прад’яўленую ў пісьмовай форме тэкставую інфармацыю: рад слоў, звязаных і не звязаных агульнай тэмай; сказ; рад сказаў, звязаных і незвязаных агульнай тэмай;

запамінаць і прайграваць словы, сказы, вершы, апавяданні, казкі і іншае пры ўспрыманні іх на слых.

## РАЗДЗЕЛ 3
## РАЗВІЦЦЁ МОЎНАГА КАМПАНЕНТА ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

3.1. Развіццё абагульняючай функцыі слова, фарміраванне моўных абагульненняў

3.1.1. Развіццё лексічнай асновы мовы, лексіка-семантычных уменняў

Назоўнікі

Уменні, якія фарміруюцца:

правільна выкарыстоўваць у маўленні словы – назвы прадметаў:

з канкрэтным значэннем;

абагульняльныя паняцці – відавыя і родавыя (мэбля, посуд, абутак, гародніна, садавіна і іншыя);

з адцягненым (абстрактным) значэннем (прыгажосць, цемра, белізна, радасць, адвага, чытанне, бег, барацьба і да таго падобнае);

з пераносным значэннем;

падбіраць антонімы (дзень-ноч, радасць-смутак і да таго падобнае);

падбіраць сінонімы (храбрасць – смеласць, мужнасць, адвага і да таго падобнае).

Дзеясловы

Уменні, якія фарміруюцца:

правільна выкарыстоўваць у маўленні словы – назвы дзеянняў, якія абазначаюць:

становішча (стаяць, сядзець, ляжаць, вісець і да таго падобнае);

рух, перамяшчэнне: толькі суб’екта (ісці, ехаць, плыць і да таго падобнае); суб’екта і аб’екта (несці, везці, катаць і да таго падобнае);

уздзеянне на прадмет, працоўную, прафесійную дзейнасць: канкрэтнага значэння (лячыць, араць, будаваць, варыць і да таго падобнае); агульнага значэння (рабіць, працаваць, вырабляць і да таго падобнае);

маўленчую і мысленчую дзейнасць (гаварыць, паўтарыць, спытаць, думаць, рашаць і да таго падобнае);

працэсы ўспрымання (слухаць, глядзець, кранаць, нюхаць і да таго падобнае);

фізічны ці эмацыянальны стан чалавека, яго дзеянні паводзін (радавацца, сумаваць, шумець, біцца і да таго падобнае);

дыферэнцыраваць і адэкватна ўжываць у маўленні дзеясловы, блізкія па семантыцы (несці – везці, ляжаць – спаць, мыць – сціраць і да таго падобнае);

падбіраць антонімы (апрануць – зняць, падняць – апусціць, кінуць – злавіць, пакласці – прыбраць і да таго падобнае);

падбіраць сінонімы (ісці – крочыць; рагатаць – смяяцца; мерзнуць – зябнуць; блішчаць – зіхацець і да таго падобнае);

ажыццяўляць перанос значэння слова на блізкія па змесце або падобныя сітуацыі, з’явы або прадметы – засваенне абагульняючага значэння слоў (абагульняючае значэнне слова адкрыць: адкрыць кнігу, адкрыць рот, адкрыць акно, адкрыць кран і гэтак далей; абагульняючае значэнне дзеясловаў з прыстаўкай за-: засмяяцца, закрычаць, завыць і да таго падобнае).

Прыметнікі

Уменні, якія фарміруюцца:

правільна выкарыстоўваць у маўленні словы – назвы прыкмет:

якія абазначаюць якасці на аснове пачуццёвага вопыту (колер, велічыню, форму, смак, паверхню, гук і іншыя);

якія характарызуюць чалавека па знешнім выглядзе і фізічных асаблівасцях (моцны, слабы, поўны, худы, здаровы і да таго падобнае);

якія абазначаюць унутраныя якасці чалавека, рысы характару (ацэначныя прыметнікі) (добры, злы, лянівы, прагны, ветлівы і да таго падобнае);

звязаных з эмацыянальным станам (радасны, сумны і да таго падобнае);

падбіраць антонімы (высокі-нізкі, светлы-цёмны, смелы-баязлівы і да таго падобнае);

падбіраць сінонімы (смелы-мужны; радасны-вясёлы і да таго падобнае);

адэкватна ўжываць у маўленні прыметнікі з пераносным значэннем (кароткія валасы – кароткая размова, лёгкі чамадан – лёгкі мароз і да таго падобнае).

Прыслоўі

Уменні, якія фарміруюцца:

адэкватна ўжываць у маўленні прыслоўі:

якія характарызуюць дзеянне або прыкмету з боку якасці, колькасці, спосабу дзеяння (добра, весела, смешна, моцна, дружна, хутка, сумесна, у адзіночку і да таго падобнае);

якія служаць паказчыкамі прасторавых адносін, звязаных з дзеяннем (далёка, блізка, злева, справа і да таго падобнае);

якія служаць паказчыкамі часавых адносін, звязаных з дзеяннем (даўно, учора, зімой, вечарам і да таго падобнае), якія абазначаюць ход падзей у часе (спачатку, потым, раней, пазней і да таго падобнае);

падбіраць антонімы (злева-справа, блізка-далёка, цёпла-холадна, весела-сумна, сумесна-у адзіночку і да таго падобнае).

Займеннікі

Уменні, якія фарміруюцца:

адэкватна ўжываць у маўленні займеннікі:

асабовыя (я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны);

прыналежныя (мой, твой, наш, ваш, свой, яго, яе, іх);

пытальныя (хто, што, які, чый, колькі);

адмоўныя (ніхто, нішто, ніякі, нічый, ніколькі);

указальныя (гэты, той, такі, столькі).

Лічэбнікі

Уменні, якія фарміруюцца:

адэкватна ўжываць у маўленні лічэбнікі:

колькасныя (два, дванаццаць і гэтак далей);

зборныя (пяцёра, двое і гэтак далей);

парадкавыя (першы, дзясяты і гэтак далей).

Фарміраванне семантычных палёў

Уменні, якія фарміруюцца:

падбіраць словы па сэнсавым падабенстве (яблыкі – грушы, слівы, садавіна, сад, ураджай; лекар – лечыць, бальніца, таблеткі і гэтак далей).

3.1.2. Развіццё ўменняў словазмянення

Словазмяненне назоўнікаў: дыферэнцыяцыя граматычных прыкмет колькасці (засваенне граматычнага значэння множнасці), склонавых значэнняў, роду назоўніка

Уменні, якія фарміруюцца:

утвараць і ўжываць у маўленні граматычныя формы множнага ліку назоўнікаў назоўнага склону (з націскным канчаткам, з ненаціскным канчаткам; без чаргавання зычных асновы, з чаргаваннем зычных асновы):

з канчаткам -і (макі, кветкі, кнігі, хлопчыкі, вавёркі, пеўні і да таго падобнае);

з канчаткам -ы (дамы, машыны, дажджы, галасы і да таго падобнае);

утвараць і ўжываць у маўленні канструкцыі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку featured рознага роду без прыназоўнікаў:

вінавальнага склону з нулявым канчаткам, з канчаткамі -у/-ю, -а/-я (дом, самалёт, аловак; сасну, лісу, бабулю; пеўня, вожыка, урача і да таго падобнае);

роднага склону з канчаткамі -а, -і/-ы (хлопчыка, пірага, стала, крэсла; сукенкі, кошкі, сястры, дзяўчыны і да таго падобнае);

давальнага склону з канчаткамі -у/-ю, -е/-ы (брату, зайцу, каню; лісе, вароне, вавёрцы і да таго падобнае);

творнага склону з канчаткамі -ам/-ем/-ом, -ай (алоўкам, мядзведзем, ручніком, сякерай, вілкай, пілой і да таго падобнае);

утвараць і ўжываць у маўленні канструкцыі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку з прыназоўнікамі: канструкцыі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку з прыназоўнікамі, засваенне абагульняючага значэння прыназоўнікаў і адпаведных склонавых канструкцый з прыназоўнікамі:

вінавальнага склону з прыназоўнікамі на, у, за, пад са значэннем напрамкаў дзеяння (кладзе на стол, у стол, пад стол, за стол);

меснага склону з прыназоўнікамі на, у са значэннем месцазнаходжання (стаіць на стале, ляжыць у стале);

роднага склону з прыназоўнікам каля са значэннем месцазнаходжання (стаіць каля школы), з прыназоўнікам з, з-за, з-пад са значэннем накірунку дзеяння (узяў з паліцы, з каробкі, з-пад стала);

творнага склону з прыназоўнікамі за, над, пад, перед са значэннем месцазнаходжання прадмета (ляжыць за кубікам, перад кубікам);

дыферэнцыраваць і адэкватна ўжываць у маўленні прыназоўнікі:

семантычна блізкія (на – у, у – з са значэннем напрамку і да таго падобнае);

антанімічныя (пад стол – з-пад стала і да таго падобнае);

адзін і той жа прыназоўнік, але з рознымі значэннямі (прыназоўнік у – у значэнні месца і напрамку: у альбоме – у альбом і да таго падобнае);

утвараць і ўжываць у маўленні склонавыя канструкцыі назоўнікаў у форме множнага ліку без прыназоўнікаў:

давальнага склону з канчаткамі -ам /-ям (лялькам, вераб'ям, дзяўчынкам, кошкам, кацянятам і да таго падобнае);

творнага склону з канчаткамі -амі/-ямі (сталамі, рукамі, алоўкамі, вёдрамі, сшыткамі і да таго падобнае);

роднага склону з рознымі канчаткамі: з канчаткамі -оў/-аў (дамоў, катоў, пірагоў, крэслаў, рамонкаў і да таго падобнае), з нулявым канчаткам (сукенак, варон, кніг і да таго падобнае), з канчаткамі -эй/-ей, эў/-яў (дзвярэй, людзей, дрэў, вучняў і да таго падобнае);

утвараць і ўжываць у маўленні склонавыя канструкцыі назоўнікаў у форме множнага ліку з прыназоўнікамі:

творнага склону (кубкі са сподкамі, вазы з кветкамі і да таго падобнае);

роднага склону (уцякае ад сабак, кампот з груш і да таго падобнае);

меснага склону (на рукавах, сталах, дамах, сумках, дрэвах, арэлях, рэках і да таго падобнае).

Словазмяненне дзеясловаў: дыферэнцыяцыя граматычных прыкмет колькасці, часу, асобы, роду

Уменні, якія фарміруюцца:

утвараць дзеясловы множнага ліку (без чаргавання гукаў у аснове слова, з чаргаваннем), дыферэнцыравана ўжываць у маўленні дзеясловы адзіночнага і множнага ліку (дзяўчынка чытае – дзяўчынкі чытаюць; хлопчык бяжыць – хлопчыкі бягуць);

дыферэнцыраваць дзеясловы цяперашняга часу па асобах:

формы дзеясловаў 1-й і 2-й асобы адзіночнага ліку (кажу, кажаш; думаю, думаеш; вырашаю, вырашаеш і да таго падобнае);

формы дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку (чытае, чытаюць; кажа, кажуць; п’е, п’юць і да таго падобнае);

формы дзеясловаў 1-й і 2-й асобы множнага ліку (збіраем, збіраеце; думаем, думаеце; каталі, катаеце і да таго падобнае);

дыферэнцыраваць дзеясловы прошлага часу па родах, дапасоўваць дзеясловы прошлага часу і назоўнікі ў родзе і ліку (пайшоў снег, рака замерзла, возера замерзла).

Словазмяненне прыметнікаў: дыферэнцыяцыя граматычных прыкмет колькасці, роду, склонавых значэнняў

Уменні, якія фарміруюцца:

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ў назоўным склоне адзіночнага і множнага ліку (дзень – доўгі, сонечны, цёплы; дні – кароткія, марозныя, доўгія);

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ў родзе ў назоўным склоне адзіночнага ліку (снег – белы, пухнаты, халодны; зіма – снежная, доўгая, марозная; сонца – яркае, ласкавае, цёплае);

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ва ўскосных склонах адзіночнага ліку (склонавыя канструкцыі без прыназоўнікаў):

форма давальнага склону (маленькаму вожыку, спрытнай вавёрцы, ласкавай кошцы і да таго падобнае);

форма творнага склону (чырвоным алоўкам, мяккім ручніком, духмяным мылам і да таго падобнае);

форма роднага склону (блакітнай сукенкі, вясёлага хлопчыка, вялікага матылька і да таго падобнае);

форма вінавальнага склону (жоўтую сукенку, белы халат, маленькі гузік і да таго падобнае);

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ва ўскосных склонах адзіночнага ліку (канструкцыі з прыназоўнікамі) (каля высокага плота, з ледзяной гары, ад злога ваўка);

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ва ўскосных склонах множнага ліку (склонавыя канструкцыі без прыназоўнікаў) (маленькім кацянятам, чырвоных яблыкаў і да таго падобнае);

дапасоўваць прыметнік да назоўніка ва ўскосных склонах множнага ліку (канструкцыі з прыназоўнікамі) (над прыгожымі кветкамі, ад злых ваўкоў, да новых дамоў і да таго падобнае).

3.1.3. Развіццё ўменняў словаўтварэння (вылучэнне, абагульненне і прадуцыраванне словаўтваральных мадэлей)

Уменні, якія фарміруюцца:

утвараць і адэкватна ўжываць у маўленні назоўнікі:

з памяншальна-ласкальным значэннем пры дапамозе суфіксаў -ік-, (-ык-); -чык-, -ічк- (-ычк-), -ечк- (-ачк-); -чк-; -ц-; -енц- (домік, ключык, садочак, чамаданчык; вазачка, спаднічка, лялечка, цётачка, дрэўца, сукеначка, акенца і да таго падобнае);

са значэннем ёмішча пры дапамозе суфікса -ніц- (цукерніца, хлебніца, мыльніца і да таго падобнае);

назвы дзяцей жывёл (лісяня, кацяня, зубраня, зайчаня, ваўчаня, кураня; ягня, цяля, шчаня, парася, жарабя і да таго падобнае);

пры дапамозе суфіксаў -нік, -ніц(а); -чык, -чыц(а), -шчык; -іст; -ец; -ар, у тым ліку тыя, якія абазначаюць прафесіі (дворнік; лётчык; гадзіншчык, кранаўшчык; настаўніца, мастачка; трактарыст, футбаліст; пісьменнік, будаўнік; прадавец, плывец; брамнік, слесар, бібліятэкар і да таго падобнае);

з суфіксам -ін-, -інк- (-ынк-) (пылінка, вінаградзінка, гарошынка, сняжынка, чаінка, пясчынка і да таго падобнае);

з суфіксам -ін(а) (вінаградзіна, бульбіна, бараніна і да таго падобнае);

назоўнікі, якія адлюстроўваюць прасторавае вымярэнне (даўжыня, шырыня, вышыня, таўшчыня, глыбіня і да таго падобнае);

утвараць і адэкватна ўжываць у маўленні дзеясловы:

закончанага і незакончанага трывання (маляваў – намаляваў, вучыў – вывучыў і да таго падобнае);

зваротныя і незваротныя (мые – мыецца, купае – купаецца, качае – качаецца і да таго падобнае);

дзеясловы з прыстаўкамі: у-, вы-, пры-, ад-, з-, пера- (унёс, вынес, прынёс, аднёс, знёс, перанёс і да таго падобнае);

супастаўляць па значэнні дзеясловы з рознымі прыстаўкамі і адным коранем (ад’ехаў – прыехаў – пад’ехаў; адрэзаць – выразаць – зрэзаць –

прарэзаць), з адной прыстаўкай, але рознымі каранямі (прыбег – прыехаў – прыйшоў), адэкватна іх выкарыстоўваць у маўленні;

утвараць і адэкватна ўжываць у маўленні прыметнікі:

прыналежныя з суфіксамі -ін-/-ын- (мамін, бабулін, сястрын і да таго падобныя), з суфіксам -оў-/-еў-/-аў- (дзядзеў, суседаў, братаў і да таго падобныя);

якасныя з суфіксам -н- (моцны, сквапны, марозны, радасны, чырвоны і да таго падобныя), з суфіксам -ліў- (дажджлівы, баязлівы, непаседлівы, клапатлівы і да таго падобнае);

адносныя з суфіксам -ав-/-ёв-/-ов- (гумовы, вішнёвы, дубовы, шаўковы і да таго падобнае), з суфіксам -н- (цагляны, зімні, грыбны, лімонны і да таго падобнае), з суфіксамі -ан-, -ян-, -енн- (скураны, ваўняны, гліняны, ранішні, саламяны і да таго падобнае);

прыметнікі з прыстаўкай не- (ня-) (невялікі, няроўны, незнаёмы, незразумелы, няўважлівы і да таго падобнае);

памяншальна-ласкальныя формы прыметнікаў (кругленькі, чырвоненькі, тоненькі, кароценькі і да таго падобнае);

ступені параўнання прыметнікаў (даўжэйшы, карацейшы, вышэйшы, танчэйшы, вузейшы і да таго падобнае);

прыметнікі з прыстаўкай без- (бяз-)/бес- (бяс-) (бяззубы, безгалосы, бязвоблачны, бязлюдны, бязветраны, бяздомны, бясшумны, бескаляровы і да таго падобнае);

прыметнікі з прыстаўкамі пад-, пры-, перад-, да-, пасля- (падводны, падземны, прывакзальны, прышкольны, прыгарадны, перадсвяточны, даваенны, пасляваенны і да таго падобнае);

складаныя прыметнікі (светла-шэры, цёмна-блакітны; штодзённы, штогадовы, штомесячны; аднапавярховы, шматпавярховы; двухметровы, аднакаляровы, трохдзённы, двухтыднёвы і да таго падобнае).

3.1.4. Развіццё ўменняў пабудовы сказаў

Фарміраванне глыбінна-семантычнай (унутранай) структуры выказвання

Уменні, якія фарміруюцца:

будаваць сказы, адлюстроўваючы ў іх розныя глыбінна-семантычныя адносіны (з паступовым павелічэннем іх колькасці ў адным сказе):

суб’ектныя: паміж дзеячам і дзеяннем (Хлопчык малюе. Шпак прыляцеў. Кошка спіць.);

аб’ектныя: паміж дзеяннем і аб’ектам дзеяння (Дзяўчынка палівае кветкі. Хлопчык малюе дом.);

лакатыўныя: паміж дзеяннем і месцам дзеяння (Дзеці збіраюць лісце ў парку.);

інструментальныя: паміж дзеяннем і прыладай дзеяння (Дзяўчынка малюе алоўкамі.);

часавыя: паміж дзеяннем і часам дзеяння (Зімой дзеці ўсталявалі кармушкі для птушак.);

атрыбутыўныя: адносіны, якія выяўляюць уласцівасці суб’екта або аб’екта (Дзеці зрабілі з лісця прыгожыя букеты.);

абазначэнне якасці дзеяння, спосабу яго ажыццяўлення (Я хутка зрабіў урокі.);

паслядоўнасці (Спачатку …, а потым … . Перад ежай трэба вымыць рукі.);

прычынна-выніковыя адносіны (Я спазніўся, таму што … . Каб быць здаровым, трэба … .);

адносіны ўмоўнасці (Калі …, то … .);

мэтавыя адносіны (Мы ідзём у сад збіраць ураджай яблыкаў.);

злучальныя адносіны;

супраціўныя адносіны;

размеркавальныя адносіны;

вылучаць у назіраемай, цяперашняй сітуацыі розныя тыпы адносін ((хто?) я (што раблю?) іду; (куды?) у бібліятэку; (навошта?) узяць новыя кнігі; (з кім?) і гэтак далей);

вызначаць сітуацыю, якая адпавядае выкарыстанай у выказванні складанай маўленчай (логіка-граматычнай) канструкцыі (разуменне пасіўных маўленчых канструкцый: маміна дачка, даччына мама; гаспадар машыны, машына гаспадара і да таго падобнае).

Фарміраванне павярхоўнай структуры сказа: афармленне глыбінна-семантычнай структуры з дапамогай сродкаў мовы ў павярхоўную структуру сказа (уменні складаць сказы розных тыпаў)

Уменні, якія фарміруюцца:

будаваць простыя развітыя сказы;

развіваць простыя сказы пры дапамозе слоў, якія абазначаюць прыметы прадмета (Бабуля дае ўнучцы чырвоную стужку.);

будаваць складаназлучаныя сказы:

бяззлучнікавыя (Восень наступіла, лісце пажоўкла і апала.);

з выкарыстаннем злучнікаў і, ды, якія адлюстроўваюць злучальныя адносіны (Квітнелі яблыні, і пахла мёдам.);

з выкарыстаннем злучнікаў а, але, затое, якія адлюстроўваюць супраціўныя, адносіны (Сястра падмятала падлогу, а я прыбірала малюнкі. Месяца не было, але ярка свяцілі зоркі.);

з выкарыстаннем злучнікаў або, альбо, то ... то, якія адлюстроўваюць размеркавальныя адносіны (То мама напячэ пірагоў, то бабуля з булачкамі прыедзе.);

будаваць складаназалежныя сказы са злучнікамі (як, што, калі; чым... тым) і злучальнымі словамі (дзе, куды, адкуль, хто, чаму, навошта, колькі, які, каторы, чый) (Я ведаю, калі ён вернецца. Рабі так, як цябе вучылі. Чым бліжэй восень, тым сумней. Я ведаю, хто гэта зрабіў. Я ведаю, чый гэта партфель.).

3.2. Развіццё ўменняў праграмавання і граматычнага структурыравання звязнага маўленчага выказвання

3.2.1. Развіццё ўменняў весці дыялог

Уменні, якія фарміруюцца:

адказваць на пытанні суразмоўцы;

задаваць пытанні, накіраваныя на атрыманне рознага роду пазнавальнай інфармацыі;

выказваць просьбу, падзяку, сцвярджэнне, адмаўленне;

удзельнічаць у дыялогу, выконваючы чарговасць выказванняў.

3.2.2. Развіццё ўменняў складаць паведамленне

Уменні, якія фарміруюцца:

складаць сэнсавую праграму выказвання (праграмаванне звязнага выказвання);

выкарыстоўваць розныя моўныя сродкі міжфразавай сувязі (прамы паўтор слоў, ужыванне займеннікаў, прыслоўяў, злучнікаў, выкарыстанне сінонімаў);

ужываць паказальнікі пачатку паведамлення, яго працягу, канца (моўнае афармленне звязнага выказвання).

Выкарыстоўваць названыя ўменні пры складанні звязных маналагічных паведамленняў розных відаў:

рэпрадуктыўных:

пераказ тэксту паслядоўнай арганізацыі (з апорай на прадметна-графічную схему; з апорай на розныя віды планаў; з апорай на малюнкі і сістэму пытанняў педагога; з апорай на сістэму пытанняў; без апоры);

пераказ тэксту паралельнай арганізацыі (апісанне) (з апорай на розныя віды планаў; без апоры);

прадуктыўных:

па наглядных апорах: аповед паслядоўнай арганізацыі па серыі сюжэтных малюнкаў; па сюжэтным малюнку; аповед-апісанне прадмета на аснове яго ўспрымання (па сістэме навадных пытанняў педагога; з апорай на сімвалічны план; самастойна);

пры частковай зададзенасці кампанентаў выказвання: складаць аповед з даданнем падзей (працягваць аповед; аднаўляць пачатак аповеду);

пры самастойным увасабленні задумы ў маўленчым паведамленні: аповед пра падзею з уласнага жыцця; на зададзеную тэму; аповед-разважанне.

3.3. Развіццё моўнага аналізу і сінтэзу

3.3.1. Развіццё фанематычнага аналізу і сінтэзу

Уменні, якія фарміруюцца:

распазнаваць гук на фоне слова;

вылучаць гук са слова (першы гук у слове, апошні гук у слове);

вызначаць месца гука ў слове (у пачатку, сярэдзіне, канцы);

вызначаць паслядоўнасць гукаў, месца кожнага гука ў адносінах да іншых гукаў у слове;

вызначаць колькасць гукаў у слове;

тлумачыць адрозненні паміж словамі на аснове аналізу іх гукавога складу (адны і тыя ж гукі, але розная іх паслядоўнасць: сон – нос; адрозненне па колькасці гукаў: шар – шары);

аб’ядноўваць паасобна вымаўленыя маўленчыя гукі ў адзіны гукавымаўленчы вобраз слова.

3.3.2. Развіццё складовага аналізу і сінтэзу

Уменні, якія фарміруюцца:

ажыццяўляць складовы аналіз слоў (дзяліць словы на склады, вызначаць паслядоўнасць і колькасць складоў у слове, месца склада ў слове адносна іншых складоў);

складаць словы са складоў;

складаць словы з пэўным складам;

складаць словы з вызначанай колькасцю складоў і іншае.

3.3.3. Развіццё моўнага аналізу і сінтэзу на ўзроўні сказа

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць структурны аналіз сказа: вылучаць словы як структурныя адзінкі сказа, вызначаць колькасць і паслядоўнасць слоў у сказе;

вылучаць лагічны націск у сказе;

складаць сказы з вызначанай колькасцю слоў;

складаць графічную схему сказа;

складаць сказы па зададзенай графічнай схеме;

распаўсюджваць сказ з апорай на сістэму пытанняў.

3.3.4. Развіццё моўнага аналізу і сінтэзу на ўзроўні тэксту

Уменні, якія фарміруюцца:

выконваць структурны аналіз тэксту: вылучаць сказы як структурныя адзінкі тэксту (першы сказ, другі, ..., апошні; колькасць сказаў у тэксце);

вызначаць межы сказаў у тэксце;

складаць суцэльны і звязны тэкст з асобных зададзеных сказаў.

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ КАРЭКЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

У вучняў сфарміравана структура мэтанакіраванай пазнавальнай дзейнасці, што знаходзіць выражэнне ў тым, што навучэнцы праяўляюць пазнавальныя інтарэсы і ўмеюць:

ажыццяўляць усвядомленую самарэгуляцыю пазнавальнай дзейнасці пры вырашэнні пазнавальных задач – валодаюць уменнямі мэтавызначэння, планавання, выканальніцкімі ўменнямі, уменнямі самакантролю, абагульнення, рэфлексіўнымі ўменнямі, сфарміраванасць якіх забяспечвае мэтанакіраванасць і арганізаванасць дзейнасці;

рэалізоўваць працэс рашэння пазнавальнай задачы, выбіраючы і выконваючы неабходныя пазнавальныя дзеянні:

вылучаць аб’екты, з’явы навакольнага свету, сімвалы, іх розныя прыкметы, правільна абазначаць словам;

арыентавацца ў прасторы;

арыентавацца ў часе;

ажыццяўляць серыйную арганізацыю рухаў, прайграваць рухальныя праграмы (на ўзроўні артыкуляцыйнай маторыкі і дробнай маторыкі рук);

выконваць універсальныя разумовыя аперацыі: аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульненне, класіфікацыю, серыяцыю;

працаваць з паняццямі, выконваць дзеянне падвядзення пад паняцце, усталёўваць адносіны паміж паняццямі;

разважаць: выказваць меркаванні, якія адлюстроўваюць сувязь паміж двума паняццямі, рабіць высновы, прыводзіць найпрасцейшыя доказы;

дабудоўваць вобразы знаёмых аб’ектаў (узнаўляючае ўяўленне), будаваць і рэалізоўваць уласныя планы-задумы (творчае ўяўленне);

выкарыстоўваць розныя мнемічныя прыёмы для запамінання і прайгравання інфармацыі;

адлюстроўваць працэс і вынік рашэння пазнавальнай задачы з дапамогай сродкаў мовы (словы, сказы, звязнае паведамленне);

усведамляць моўную рэчаіснасць як адрозную ад прадметнай і рэалізоўваць у ёй пазнавальныя задачы: засваенне моўных абагульненняў, выкананне моўнага аналізу і сінтэзу (на ўзроўні слова, сказа, тэксту).